Любоўныя замовы Веткаўшчыны не проста этнаграфічныя ці фальклорныя помнікі. Дадзены від замоў, хутчэй, – помнікі культурна-антрапалагічныя. Яны максімальна ахопліваюць і адлюстроўваюць усе адносіны, усе пачуцці, што ўзнікаюць паміж мужчынам і жанчынай на працягу ўсяго жыцця, яны – помнік сацыякультурнай адаптацыі любоўнай (ці шлюбнай) пары да прыроднага і чалавечага асяроддзя традыцыі.

**Спіс літаратуры:**


1. Байбурін, А.К.  Жіліще в обрядах і представленіях восточных славян / А.К. Байбурін // Ленінград: Наука – 1983. – 191 с.
2. Барташэвіч, Г.А. Беларускіе замовы / Г.А. Барташэвіч // Замовы / Уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г А. Барташэвіч; Рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд). і  інш. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – с. 5-30.
3. Валодзіна, Т. Лазня / Т. Валодзіна // Міфалогія беларусаў Энцыкл. слоўн. / Склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка. – Мн.: Беларусь,2011. – С. 269-270.
4. Лапацін, Г.І. Чым распінаюць змеяў ды бьюць курапаў / Г.І. Лапацін //  Этнаграфія Падняпроўя: Матэрыялы навуковай канферэнцыі: 30 лістапада – 1 снежня 1992 г. / Склад. В.М. Аненкаў, А.С. Сугака, С.Б. Рыбакова. – Выдавецтва МДУ імя А.А. Куляшова, – 1999. С. 86 –  90.
5. Лобач, В.А Эрос в белорусской традіціонной культуре  /В.А. Лобач // Белорусскій эротіческій фольклор / Ізд. под. Т.В. Володіна, А.С. Федосік. М.: Ладомір, 2006. С. 53-109 с.



***Ларыса Раманава***


## АПЫТАЛЬНІК «ПЧОЛЫ Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ»


*Артыкул прысвечаны даследаванню існавання бортніцтва, пчалаводства ад мінулага да сучаснасці на тэрыторыі Беларусі. У разгледжаным у ім апытальніку «Пчолы ў традыцыйнай беларускай культуры» ўвага звернута на неабходнасць збору палявога экспедыцыйнага матэрыялу, які датычыць фальклорных, этнаграфічных запісаў, тэрміналогіі бортніцтва, пчалярства.*



***Larysa Ramanava***


## QUESTIONNAIRE «BEES IN TRADITIONAL BELARUSIAN CULTURE»


*This article explores the history of beekeeping in Belarus. The author compiled a questionnaire «Bees in traditional Belarusian culture», where attention is drawn to the need to collect field expedition material, which relates to folklore, ethnographic records, and beekeeping terminology.*


Пчолы, як і птушкі, – пасрэднікі паміж Богам і людзьмі ў традыцыйнай беларускай культуры, сімвал працавітасці, мудрасці, уваскрашэння. Бортніцтва як старадаўні лясны промысел, пчалаводства, культурнае развядзенне пчол, галіна сельскай гаспадаркі – тэмы, збольшага малавядомыя сучаснікам. У параўнанні з іншымі абласцямі Беларусі, на Гомельшчыне, Берасцейшчыне бортніцтва, калоднае пчалярства захавалася найбольш. Так, па словах стваральніка «Братэрства босых бортнікаў» Івана Дзмітрыевіча Осіпава, на Палессі бортнікаў налічваецца больш за сто чалавек. Дзе-ндзе ў адселеных пасля Чарнобыльскай АЭС мясцінах даволі рэдка, але яшчэ можна ўбачыць калоду (вулей з цэльнага ствала) на дрэве ці на зямлі – сведчанне таго, што тут працавалі бортнікі. Багатыя на бортнікаў Лельчыцкі, Жыткавіцкі, Рэчыцкі раёны Гомельшчыны.

Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча ўнесла бортніцтва ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны (2016). Для Беларусі гэта таксама актуальная тэма. У апошнія гады ў Беларусі робяцца захады – найперш Братэрствам босых бортнікаў – унесці бортніцтва ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Асобныя пчаляры імкнуцца далучыць сучаснікаў да сваёй працы, давесці да грамадства ідэю аб захаванні гэтага даўняга традыцыйнага занятку і, увогуле, захаванні саміх пчол. На тэрыторыі Беларусі існуе параўнальна нямнога аграсядзіб, экамузеяў, гаспадары якіх  паказваюць наведвальнікам, турыстам моманты з жыцця пчол і працы пчалавода, распавядаюць пра пчаліныя таямніцы. Так, у Чачэрскім раёне, на Гомельшчыне, ёсць аграсядзіба «Пчаліны рай». Экамузей «Пчальнік», створаны ў Чавускім раёне, на Магілёўшчыне, цікавы як дарослым наведвальнікам, так і дзецям: Віктар Іванавіч Панасюк, сябра рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Беларускія пчаляры», зрабіў для сваёй пасекі шкляны вулей, каб была магчымасць бліжэй назіраць за жыццём працавітых пчолак.

На маю думку, у апошнія гады усё больш людзей імкнуцца далучыцца да пчалаводства, да традыцыйных абрадаў і святаў, у якіх выкарыстоўваюцца прадукты пчалаводства, сімволіка пчалы. Дзеля прыкладу: у 1960–70-ыя гады на Вялікдзень каля царквы ў былой вёсцы Барталамееўка (адселена пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС) мясцовыя жыхары спальвалі пустыя, старыя вуллі як ахвяру для Бога): «У нас вуллі палілі на Паску. Паставяць возьлі цэрквы і запалюць. Агонь шугае, а тады як стрэліць! Хлопцы ўкінуць што-та такоя, штоб луччай гарэла» [1, с. 100].

У Веткаўскім музеі стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Шклярава (ВМСіБТ імя Ф. Шклярава) цягам 30 гадоў сабраны вялікі палявы матэрыял пра даўні абрад – «Свячу», які існуе і сёння. Ён стаў асновай для стварэння кнігі «Ікона звалась “Свячой”», аўтар якой – Г. Лапацін, вядучы навуковы супрацоўнік Веткаўскага музея, таксама – для стварэння выставы з такой жа назвай, якая экспануецца ў дадзены момант у філіяле музея ў Гомелі, для стварэння шэрагу навуковых артыкулаў і нават – цыкла лекцый. Вядома, існаванне абраду (на працягу некалькіх стагоддзяў (!) без выкарыстання аднаго з галоўных атрыбутаў  – вялікай васковай свячы, таксама – малых свечак, мядовай сыты было б немагчымым.

Беларуская культурная прастора ў апошнія гады папоўнілася дзвюма цудоўнымі выставамі, якія дапамаглі ўявіць маштабы, асаблівасці развядзення пчол як на тэрыторыі сучаснай Беларусі, так і ў асобных раёнах Гомельшчыны, Брэстчыны. Гэта – фотавыстава «Апошнія бортнікі Еўропы, якіх я сустрэў», адкрыццё якой адбылося 21.04.2017 (ДзУК «Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр»), на якой экспанаваліся фотаздымкі Кшыштафа Хейке, прылады працы бортнікаў, інш. рэчы, а таксама выставу «Пчолачкі гудуць, хатку будуюць...», наладжаную супрацоўнікамі ВМСіБТ імя Ф. Шклярава і Братэрствам босых бортнікаў на філіяле музея ў Гомелі (выстава дзейнічала з 8.07.2018 па 30.11.2018). На  гэтай выставе, акрамя надзвычай цікавых экспанатаў (некалькі лязіваў, скура мядзьведзя, лазьбень, ды інш)., была прадстаўлена выява – фрагмент карты вандроўніка Алафуса Магнуса, на якой тэрыторыя сучаснай Беларусі была пазначана малюнкам борцевага дрэва, прыладай бортніцтва – палкай-самабіткай. Існаваннем бортніцтва, менавіта гэтага старажытнага промысла, на думку стваральніка карты, была адметнай наша тэрыторыя ў XVI ст.

Звесткі, прыведзеныя аднымі з аўтараў выдання «Этнаграфія Беларусі» У. Гурковым, С. Цярохіным, уражваюць. «Мёд і воск былі галоўнымі відамі экспарту. У пач. XVI ст. толькі праз Полацкую мытную камору штогод вывозілася больш за 2 тыс. пудоў воску. У той час на Беларусі было больш 1 млн. борцяў, таварная прадукцыя якіх перавышала 0,5 млн. пудоў мёду штогод. Бортніцтва было прыбытковай галіной гаспадаркі. У 1773 г. Члухаўскае лясніцтва ў Аўгустоўскай пушчы за продаж драўніны выручыла 14 талераў 25



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грошай, а бортны падатак склаў суму 507 талераў» [2, с. 84]. З канца XVII ст. у сувязі з распрацоўкай зямлі пад ворыва, масавым высяканнем лясоў, бортніцтва прыйшло ў заняпад, у першай палове XIX ст. яно саступіла месца калоднаму пчалярству.

Важную ролю бортніцтва, пчалярства ў жыцці мясцовых людзей у мінулыя стагоддзі можа падцвердзіць тэкст шчадровай песні, запісаны даследчыкам М. Гаршковым у в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна. Даўней, паводле звычая, «шчодры просяцца: «Цётачка, дзядзечка, благаславі песянку спець... Спявалі – «салдату Раману» з тлумачэннем «як будзе іціць у салдаты», «хлопцу», дзеўцы», «большаму, «маламу», «што папарна жывуць, мужыку й жонцы», «панам», «пчолам»... У гэтым пераліку пчолы – удзельнікі сям'і і гаспадаркі. Заўважым, што ніякой другой жывой істоце, якая была ў дамашняй гаспадарцы (конь, карова і т. д. шчадровых песень не прысвячалі). Тэкст «шчадроўкі» – гэта дыялог, адзін з удзельнікаў якога – старая матка: – А хто гэта йдзе – дуброва гудзе? / Святы вечар, дуброва гудзець! / Старая пчолачка раёчык вядзець. / Святы вечар, раёчык вядзець! / – Маладыя райке, садзісь у вулляйке. / Святы вечар, у новыя вулляйке! / Нясіце, райкі, сладкія мядкі. / Святы вечар, сладкія мядкі! / А я, старая, жоўтыя васкі. / Святы вечар, жоўтыя васкі! / Сладкія мядкі – людзям на канун, / Жоўтыя васкі – Богу на свячкі... [3, с. 80-85].

Некаторае ўяўленне пра важную ролю, якую нашы продкі надавалі развядзенню пчол, дае цікавы дакумент «Опісаніе староства Чечерского, находящегося в Рогатінской провінціі», складзены ў 1773 г., адразу пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай. У 1772 г. усходняя Беларусь стала часткай Расейскай імперыі. Невядомы укладальнік (магчыма, ён быў не адзін) старанна рабіў апісанне новых уладанняў. У тэксце ёсць радкі: «Крестьяне как самі объявілі, кормятся от хлебопашества, імея прітом некоторое вспомоществованіе от содержанія пчёл в лесах, прібыток для поташной фабрікі от поставкі в оную золы очень почітают замалой; ібо по іх объявленію один крестьянін в неделю неполную віленскую бочку ілі 2 четверті золы пріготовіть может, за что только 15 получіт копеек» [4, с. 12].

Дарэчы, у гэтым дакуменце даюцца звесткі аб высяванні канопляў у буйных памерах, у тыя часы менавіта з пянькі выраблялі канаты, вяроўкі для рачных і марскіх суднаў, вяроўкі з пянькі выкарыстоўвалі ў вясковай гаспадарцы. Каноплі – расліна, прывабная для пчол: з кветак канопляў пчолы збіраюць пылок, частка якога ідзе на выраб прапаліса – рэчыва, якім на зіму пчолы «заклейваюць» маленькія шчылінкі ў вуллі. У «Экспедыцыйных матэрыялах» Веткаўскага музея ёсць запісы аб былым існаванні прыватных пасек ў асобных вёсках Веткаўскага, Чачэрскага раёнаў, аб існаванні пасекі з калоднымі вуллямі (у XX ст)., сабраны асобныя звесткі, якія датычаць традыцыйных уяўленняў, звязаных з пчалой, пчалаводствам. Ёсць звесткі аб працы сучасных пчалаводаў: Івана Цімафеевіча Транькова, Міхаіла Аляксеевіча Крышчыхіна, Ігара Васільевіча Медзіна, Васіля Рыгоравіча Ціпунова, Уладзіміра Пятровіча Шыцікава, Валерыя Рыгоравіча Рудкоўскага, Міхаіла Стэфанавіча Кавалькова, ды іншых, якія гадуюць пчол у Данілавічах, Стаўбуне, Ветцы, Прысно, Радузе, Фёдараўцы, Навасёлках, Старым Сяле, Залатым Розе, Неглюбцы... Яны па-сапраўднаму слугуюць пчолам.

Праца па апытальніку, ёсць спадзяванне, дапаможа ўсім, хто вырашыў занатаваць веды, уменні нашых продкаў і сучаснікаў, звязаныя з бортніцтвам, пчалаводствам як часткай беларускай – духоўнай і матэрыяльнай культуры. Праца гэта датычыць этнографаў, эколагаў, моваведаў, гісторыкаў, настаўнікаў, іншых зацікаўленых людзей. Добры ўнёсак у гэтую справу – выданне манаграфіі «Лексіка народнай гаспадаркі ў гаворках Мазырска-Прыпяцкага Палесся», аўтары якой – А. Станкевіч, А. Воінава, Л. Мінакова. Менавіта ў гэтай працы занатавана: «Дворнік – чалавек, які збіраў мёд у вуллях, што размяшчаліся на дрэвах; «от прыходзіў час мёд збіраць, за ім дворнік на дзераво лез» (в. Каменка, Мазырскі раён) [5, с. 284]. Сімволіка борці, пчалінага дому з цягам часу пачала атаясамлівацца з з домам, дваром чалавека. У пчалінай калоды ёсць «шапка» або «галава» – верх калоды, ёсць «пята» або «под» – ніжняя частка калоды.. Ёсць цэнтр, нутро; «гняздом» сучасныя пчалаводы называюць цэнтральную частку вулля (там жыве, гадуецца пчаліны расплод – заўтрашняе пакаленне пчол). У пчол ёсць «калошкі» – пылок, які рабочыя пчолы збіраюць сабе на ножкі ранняй вясной, ды і пазней з жоўтых «коцікаў» вярбы, з клёна, маць-і-мачыхі, іншых кветак. Жоўты колер – самы любімы ў пчол. У іх ёсць свая ежа, неабходная ў першую чаргу, для вырошчвання пчаліных дзетак (чэры). Пчаляры іншы раз называюць яе «хлябінай». Гэта – пярга, пылок, пакладзены ў соты.

Такім чынам, даследванне жыцця пчол і самых розных цікавых з'яў, звязаных з імі – найпрыемны занятак (не кажучы ўжо пра падтрыманне пчалінай «цывілізацыі»), які прыносіць не толькі задавальненне, здароўе, але й вялікую пазнаваўчую каштоўнасць. Разгледзім змест некалькіх раздзелаў апытальніка «Пчолы ў традыцыйнай беларускай культуры».

**Агульныя звесткі.** 1. Прозвішча, імя, імя па-бацьку, год нараджэння. 2. Адукацыя. 3. Веравызнанне (чалавека, які гадуе пчол) 4. Нумар тэлефона, дамашні адрас. 5. Звесткі пра пчаляра: месца і год нараджэння. 6. З якога году займаецеся пчалярствам (бортніцтвам)? 7. Ці былі пчаляры ў вашым родзе? Ці ёсць нехта, хто дапамагае Вам зараз? 8. Хто рабіў вуллі для Вашай пасекі (самі рабілі, куплялі ў магазіне, перайшлі ў спадчыну, трапілі з былых пасек)? 9. Хто рабіў калоды, борці, «лавушкі» у вашай мясцовасці? У якіх урочышчах яны знаходзіліся? 10. Назавіце імёны, прозвішчы вядомых Вам пчаляроў, бортнікаў у Вашым населеным пункце, бліжэйшых вёсках.

**Пчолы ў фальклоры, традыцыйных уяўленнях, абрадах**. 1. Запішыце загадкі, прымаўкі, анекдоты, былічкі, псальмы, легенды, песні каляндарна-абрадавага (ды інш). цыклаў, у якіх згадваецца пчала, пчаліная матка, рой, раенне, вулей. (Варта звярнуць увагу на «шчадровыя» песні). Адкуль з»явіліся пчолы? 2. Чаго трэба чакаць, калі прысніцца жывая (мёртвая) пчала, рой, раёўніца, агляд пчалінай сям»і, аграбанне роя, вулей, калода ў лесе? 3. Чаго трэба чакаць, калі пчала заляціць у хату? Што з ёй рабіць? 4. Як казалі пра знікненне пчалы: «прапала», «здохла», «памерла»? 5. У які дзень, (мужчынскі, жаночы), на якое свята даўней пчаляры выносілі вуллі з амшэня на пасеку? З чым гэта звязана? Якім чынам гэта адбывалася?. Што казалі пры гэтым? Ці асвячалі вуллі? Чым? (Галінкай елкі, жытнімі каласамі, інш).? Ці ставілі столік каля пчол, на ім – гаршчок? Ці выконваеце гэтыя дзеянні ў наш час? 6. Да якіх хрысціянскіх святых звяртаюцца пчаляры, бортнікі з малітвамі пра тое, каб пчолы добра вадзіліся, каб быў мёд? 7. Што значаць пчолы, пчалаводства ў Вашым жыцці? 8. Ці вешалі на Тройцу ў пчальніку, амшэні траецкую зяляніну? Ці выкарыстоўвалі яе ў лячэнні? 9. Ці быў звычай пекчы з цеста крыжыкі на Серадапосце (чацвёрты тыдзень («Крестопоклонная неделя») Вялікага посту)? Да прыкладу: «У сераду, на Хрэстапаклонным тыдні пякуць крыжыкі. Першы – на выган скаціны, скаціна і гаспадар з»ядаюць крыжык, другі – бярэ як засявае, у поле ідзе сеяць. А трэцці – як ідзе пчолы глядзець, то дзержыць тры крыжыкі. (Гомельская вобл., в. Стадолічы). 10. Ці асвячалі дом, пабудовы, вуллі на Хрышчэнне Гасподняе? Калі асвячалі, то чым? (Галінкай елкі, жытнімі каласамі, інш).? Што казалі пры гэтым? Ці асвячаеце зараз? Што пры гэтым кажаце? 11. Ці пісалі крыжыкі мёдам у вашай мясцовасці на Хрышчэнне? (Да прыкладу: «На Шчадрэц, на Багату куццю, толькі з мёду бортнікі пісалі на бруссі так і так – хрэста зробіць, ілі на вокнах, штоб ужэ мёд насілі пчолы. (Гомельская вобл., в. Стадолічы). 12. У якія дні прынята было сукаць свечы, перад якімі святамі? Хто гэтым займаўся? Якімі спосабамі гэта рабілі? 13. Ці была аброчная «Свяча» ў вашай мясцовасці? Ці ёсць яна цяпер? З якога воску рабілі гэтую свячу? Хто нёс у руках васковую «Свячу» у новы дом, якім чынам? З чым гэта звязана? Ці запальвалі яе, калі пераносілі? Якія стравы з мёдам гатавалі для абеду на «Свячы»? Запішыце назвы страў, рэцэпты. 14. З якога воску рабілі свечы на пахаванне, памінкі? З якога воску рабілі свечы для хрышчэння, для вянчання, для вяселля? З чым звязаны адрозненні? 15. Якія стравы з мёдам гатавалі для вяселля, для хрышчэння, для Куцці, для дажынкавага абеду, для памінальнага абеду, пахавання? Як іх называлі? З чым звязана ўжыванне мёду ў гэтыя дні? 16. Ці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўпрыгожвалі вясельныя дрэўцы (звычайна гэта была ялінка) свечкамі, кветкамі? Хто ўпрыгожваў? Што з гэтымі свечкамі, кветкамі рабілі пасля заканчэння вяселля? 17. Ці ўпрыгожвалі вясельныя свечы раслінамі, кветкамі (якімі?), стужкамі (лентамі), зернем, чырвонымі ніткамі? Свечы трымалі ў руках маладыя ці нехта іншы падчас вянчання? Хто іх трымаў? Ці назіралі Вы асабіста такія дзеянні? 18. Хто з родных (чалавек з іншай сям'і) сукаў вясельныя свечкі? (Напрыклад: «Хросны бацька свечку суча маладому, вялікую, каб не ўдавец быў»). 19. У якія святы прынята асвячаць мёд, частаваць суседзяў мёдам? З чым гэта звязана? 20. Як называюць чалавека, які а) даглядае борцевых пчол у лесе, каля свайго дома, на пасецы (бортнік, барцялаз, зямец, вотчыч, пасечнік, пчаляр, мядовік, пчалавод, пчаладур, інш).; б) збіраў мёд у калодах, што размяшчаліся на дрэвах (дворнік, інш. (в. Каменка, Мазырскі раён))? 21. Ці быў звычай спальваць пустыя старыя вуллі каля царквы на Вялікдзень? Што пры гэтым казалі? Дзеля чаго так рабілі? 22. Ці вешалі ў доме, амшаніках, на пасецы іконы апекуноў пчалаводства? Магчыма, Вы назіралі такую з»яву? 23. Ці гадалі з дапамогай воску на Шчодры?

**Расліны, грыбы, дрэвы ў пчалаводстве; з вопыту выкарыстання Іншыя пытанні, якія датычаць развядзення пчол**. 1. Што трэба зрабіць, каб на працягу зімоўкі ў вуллі было суха? (Будаваць цэнтральную частку вулля з елкі, класці узбок гнездавых рамак «уцяпленне» з верасу, папаратніку, уцяпляць вулей пры яго пабудове льняным пакуллем, сфагнавым мхом, рабіць нешта іншае)? 2. Як завуць месца, дзе стаяць вуллі, калоды, дзе знаходзяцца борці (пчальнік, пасека, вульнік, інш).? 3. Як называюць пылок з кветак, які пчолы збіраюць на свае ножкі, яшчэ не пакладзены ў соты? 4. Як называюць корм для пчол, укладзены ў соты (абножка, калошка, хлябец, хлябіна, краска, пярга, інш).? 5. Як называюць посуд для захавання сотаў з мёдам, мёда, выраблены з дрэва (кадоўб, ліпечня, лазьбень, ліпаўка, мерка, палумерак, гарнец, доўбанка, бачурка, каробка, інш).? 6. Чым Вы падкурваеце пчол: а) Парахнёй (парахном, гнілушкамі)? Парахнёй з якіх дрэў (вербы, сасны, бярозы, вяза, інш).? З якіх дрэў нельга браць гнілушкі? б) Высушанымі грыбамі (напрыклад, «курушкай» – высушанай губка, якая ёсць найчасцей на бярозе, «дажджавіком» («порхаўкай»); (грыб белага колеру шаравіднай формы)? в) Сухой анучай? 7. Ці называлі даўней у Вашай мясцовасці калоды, вуллі «пнямі»: пасека ў 10 пнёў, г.зн. пасека з 10 вуллямі? З чым гэта звязана? 8. Як называюць пчаліную матку – адпаведна яе ўзросту: «Маладая матка», «баба», «бабоўка», інш? – адпаведна яе пладавітасці: «добрая матка», «трутнёўка», «жыравая матка»? – адпаведна чаму яе называлі: «смародаўка», «малінаўка», «крушынаўка», інш.? 8. Якія ворагі з навакольнага асяроддзя (птушкі, насякомыя, звяры,чалавек, інш)., на Вашу думку, найбольш небяспечныя для пчол? Чаму? 9. Што азначаюць словы «уза», «науза», «наузіць вулей», «тварба», «натор», «напрыск», олек (олік), зрэцовы мёд, сыта? Ці чулі Вы іх раней? 10. Якія прыкметы ў прыродзе падцвярджаюць, што ў гэтым г. будзе шмат мёду, ці, наадварот, яго будзе мала? 11. Калі пчолы спяць? Ці ёсць сон у пчол? 12. Ці паведамляюць пчолам, што памёр той чалавек, які іх даглядаў? 13. Як называлі калоды пчол у лесе (стоўпаны, стаяны, ляжак, лежань, сапетка, ступка, бучок (бучэк), лазобка, дуплянка, навароцень, смаляк (са смалістага дрэва)), піпетка (саламяны вулей; в. Стралічава, Хойніцкі раён), інш.? 14. З якіх дрэў, у якую пару года рабілі калоды ў лесе, вуллі на пасецы (асіна, дуб, ліпа, сасна, елка, інш).? Чаму менавіта з гэтага дрэва? 15. Ці карыстаецеся вы матамі для ўцяплення пчол на зіму, зробленымі з саломы? 16. Як называецца прылада, з дапамогай якой рабілі саламяныя маты? З якога дрэва яе рабілі? 17. Ці бачылі Вы ў нашай мясцовасці вуллі, зробленыя з саломы, з лазы, іншых прыродных матэрыялаў? 18. Ці бачылі Вы калоды, борці ў лесе з бортнымі знакамі (знамёнамі)? Дзе, у якой мясцовасці? 19. Ці бачылі Вы (чулі расказ) пра старыя бортныя дрэвы? У якіх мясцінах яны знаходзіліся (знаходзяцца)? 20. Як называецца дрэвы з двумя борцямі (блізняк, інш)., з трыма і больш (матка, каралева, інш).? Што азначае: «крамлёнае дрэва»? 21. Якім чынам можна прывабіць пчол у лесе? Як Вы гэта робіце? Як робяць Вашы знаёмыя? Якім травамі карыстаецеся (націраеце сценкі лавушкі, абкурваеце дымам з раслін, пырскаеце настоем з траў)? Якія словы прамаўляеце? 22. З чаго даўней рабілі раеўню? Як па-другому яе называлі? Як яна выглядала? 23. З чаго даўней рабілі дымар? Як ён выглядаў? Як яго называлі? 24. Ці захаваліся ў Вас фотаздымкі сваякоў, родных, аднавяскоўцаў, на якіх можна ўбачыць калоды, вуллі, пасеку, якія існавалі ў XIX, XX стст.? 25. Як называюць асаблівы выгляд ніжніх канцоў сотаў, які назіраецца ў сямействе пчол, дзе ёсць трутнёвая матка (шышка, інш).? 26. Як называюць часткі борці, калоды, вулля (гняздо, галава, шапка, пята, круж»е, под , інш).? Чаму менавіта так называлі, называюць? 27. Як называюць віды мёда, сабранага з розных кветак: а) па колеры б) па саставу? 28. Як называюць стан пчол, калі яны сядзяць кучай на вуллі, вымушаныя так рабіць з-за недахопу ўзятку (посед, барада, інш).? 29. Як называюць па-іншаму пчаліную чэр (дзеткі, дзятва, інш).? 30. Як называюць рой пчол, які выйшаў з борці (калоды) і сам знайшоў сабе жыллё ў дупле ці борці? (Дзічок, бароўка, слепет, слепецень, інш).? 31. Як называюць лятoк у калодным вуллі, у сучасным вуллі (вока, очы, інш). 32. Як называецца спецыяльна абсталяванае месца пад калодачныя вуллі ў лесе (поды, інш).? 33. Як называецца месца для пастаноўкі калоды на дрэве (садно, інш).? 34. Як называецца памост на дрэве пад калоду (поткур, інш).? 35. Назавіце расліны, якія вы самі сееце для медазбору. 36. Назавіце расліны, дрэвы, якія, на вашу думку, трэба сеяць, высаджваць для медазбору. 37. Назавіце расліны, дрэвы, з якіх Вашы пчаліныя сем»і збіраюць нектар, абножку. 38. З якіх раслін Вы самі робіце лекі, каб вылечыць пчол ад хвароб (з палыну, з попелу бярозавых галінак і лісця, інш).? 39. Якія прадукты пчалаводства самыя карысныя? 40. Пра што спявае пчаліная матка? Як часта вы чулі, слухаеце яе спевы? 41. Што трэба зрабіць дзеля таго, каб пчолам жылося лепш?

**Спіс літаратуры:**

1. Экспедыцыйныя матэрыялы Веткаўскага музея стараабраднціцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Шклярава (далей – скарочана: ЭМ ВМС і БТ імя Ф. Шклярава), у тэкстах захоўваюцца моўныя асаблівасці інфармантаў. Запісала ад А. Басянковай, 1931 г.н. (нар. і жыла ў в. Барталамееўка Веткаўскага раёна) у Ветцы 19.10.2001 Л. Раманава. – Сш. 53. – С. 100.

2. Гуркоў, У. Бортніцтва / У. Гуркоў, С. Цярохін // Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. (Беларус. Сав. Энцыкл. ; Рэдкал.: І. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1989. – С. 24..

3. ЭМ ВМС і БТ імя Ф. Шклярава. Запісаў ад А. Суднека, 1937 г. н., М. Хамяковай, 1942 г. н., А. Хамяковай, 1929 г. н., Т. Хамяковай, 1935 г. н., У. Хвяськовай, 1939 г. н., В. Каралёвай, 1929 г.н., Н. Давыдзенка, 1942 г. н. у в. Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна 11.01.1997 М. Гаршкоў. – Сш. 52. – С. 80–85.

4. Мыцык, Ю. Чачэрскае староства ў апісанні 1773 года / Ю. Мыцік // Беларускі Гістарычны Агляд. – Том 24. – Сшыткі 1–2 (46–47). – снежань 2017 // Nashkraj.info [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://nashkraj.info/chacherskae-starostva-u-apisanni-1773-goda/. – Дата доступу : 28.03.2019.

5. Станкевіч, А. Лексіка народнай гаспадаркі ў гаворках Мазырска-Прыпяцкага Палесся: манаграфія / А. Станкевіч, А. Воінава, Л. Мінакова / М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф.Скарыны, 2008. – 312 с.

*Елена Макаревич*

**СУЕВЕРИЯ В ТРАДІЦІОННОЙ КУЛЬТУРЕ БЕЛОРУСОВ**

*Данная статья направлена на исследование языческих верований белорусов. По мнению автора, духовная жизнь белорусов имеет целый ряд весьма интересных для наблюдения проявлений, которые требуют особого анализа.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ